Шыфр:_______________________

Колькасць балаў:_______________

Месца:__________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

_______________ В.А. Будкевіч

25 снежня ________ 2012 года

# III ЭТАП XXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень, 2013 г.*

**10 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Перакладзіце на беларускую мову сказы з рускім словам *нет*.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) *Нет* сомнения в том, что… | |
| 2) *Нет* чтобы помочь! Сел и сидит! | |
| 3) В библиотеке *нет* этой книги. | |
| 4) *Нет*, ты только посмотри! | |
| 5) Его всё *нет* и *нет*. | |

**Заданне 2.** Падкрэсліце ў кожным радзе слова(ы) з арфаграфічнымі памылкамі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1) д’ябал, між’ярусны, Пракоф’еў, бар’ер, іньекцыя;
2) энтузіазм, спецыяльны, меліярацыя, дыалект, асацыяцыя;
3) радыёантэна, восьмігадовы, баепрыпасы, саракагоддзе, водасховішча.

**Заданне 3.** Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу адзіночнага і множнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

*Узор: спаць – спі, спіце.*

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) дзякаваць | | |
| 2) ашчаслівіць | | |
| 3) ліць | | |
| 4) секчы | | |
| 5) накрыць | | |

**Заданне 4.** Перакладзіце фрагмент з пасляслоўя Францыска Скарыны да кнігі "Руф" на сучасную беларускую мову (неабавязкова перакладаць літаральна, дастаткова перадаць асноўную думку).

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Доконана ест книга Руф, выложена и вытиснена повелением и працею ученаго мужа Франциска Скорины из славнаго града Полоцка, в лекарстве и в науках доктора, у великом месте Празском тысещи пятистех и девятинадесяти Богу в Троици единому и матери его со всими святыми ко чти и людем посполитым к науце.

**Заданне 5.** Падкрэсліце словы, у якіх адсутнічае прыстаўка.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Агарод, агурок, агучваць, адкладваць, адліга, адцяць, адчуваць, ажыць, ажына, азімыя.

**Заданне 6.** Растлумачце значэнне словазлучэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| словазлучэнне | значэнне |
|---|---|
| 1) *зорка* першай велічыні | |
| 2) пуцяводная *зорка* | |
| 3) узыходзячая *зорка* | |
| 4) хапаць *зоркі* з неба | |
| 5) нарадзіцца пад шчаслівай *зоркай* | |

**Заданне 7.** Запішыце названыя знакі прыпынку ў храналагічнай паслядоўнасці іх ўвядзення ў пісьмовую практыку ўсходніх славян: *двукроп'е (:), клічнік (!), працяжнік (—), пытальнік (?), шматкроп'е (…).*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Час увядзення | Знак прыпынку |
|---|---|
| 1) канец XV ст. | |
| 2) канец XVI ст. | |
| 3) канец XVII ст. | |
| 4) сярэдзіна канец XVIII ст. | |
| 5) канец канец XVIII ст. | |

**Заданне 8.** Адкажыце на пытанні віктарыны.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

1. Каго з беларускіх пісьменнікаў называлі "наш Вальтэр Скот"?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

2. Запішыце прапушчанае імя героя верша М. Багдановіча.

_______________, *доктар лекарскіх навук,*

*У доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры,*

*Яны спрыяюць! Час!...*

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

3. З кім развітваецца А. Куляшоў у вершы "Бывай…"?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

4. Які вобраз у трылогіі "На ростанях" становіцца сімвалам раз'яднанасці Лабановіча і Ядвісі, узмацняе адчуванне адзіноты герояў?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ______________________________________________

**Заданне 9.** Каму з пералічаных герояў "Раскіданага гнязда" Янкі Купалы належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з адпаведнымі персанажамі. Адказ запішыце ў форме спалучэння ***"лічба–літара"*** (напрыклад, 6-е).

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | *"Трэба праўды шукаць не тапаром, а розумам".* | **а.** Зоська |
| **2.** | *"Калі кідаў сягоння на бацькаў труп зямлю, то мне здавалася, што ...засыпаю самога сябе, сваё шчасце, свае леты маладыя...".* | **б.** Сымон |
| **3.** | *"Час, Сымоне, час!.. Агляніся, Сымоне!.. Успомні матку, сястру сваю ўспомні... і тую вяроўку, на якой бацька твой павесіўся!".* | **в.** Лявон |
| **4.** | *"Чалавек страляе, а чорт кулю носіць".* | **г.** Марыля |
| **5.** | *"Ці з багатым беднаму судзіцца? Пакуль з багатага пух, то з беднага дух".* | **д.** Незнаёмы |
| **6.** | *"Я пайду папрашу іх, можа..."* | **е.** Старац |
| **7.** | *"А я ўсё-такі пайду адгэтуль на кожны выпадак. Каб іх паляруш!"* | **ж.** Данілка |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ______________________________________________

**Заданне 10.** Вызначце вершаваны памер прыведзеных ніжэй радкоў. Назавіце аўтара і літаратурны твор, з якога ўзяты гэтыя радкі.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

*Буду ў далёкім краю я нудзіцца,*
*У сэрцы любоў затаіўшы сваю;*
*Кожную ночку на зорку дзівіцца*
*Буду ў далёкім краю.*

| Аўтар твора | Назва твора | Вершаваны памер твора |
|---|---|---|
| | | |